# Адукацыя ў Беларусі

**Доля выдаткаў на адукацыю ў валавым унутраным прадукце рэспублікі - 5,3% (у Расіі – 4,3%, у Казахстане - 3,6%).**

**У Беларусі ёсць дзяржаўныя навучальныя установы - 22 універсітэты, 14 тэхнікумаў, 19 каледжаў. Амаль у кожнай назве універсітэта ёсць слова беларускі, аднак, ніводзін з іх такім, пасутнасці, не з'яўляецца. Свядомыя беларусы мараць аб адкрыцці хаця б аднаго нацыянальнага ўніверсітэта, дзе навучанне будзе ісці па-беларуску.**

**У 2006 годзе пабудаваны новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі, заснаванай у 1922 годзе. Вышыня 20-павярховага будынка 72,6 м, агульная плошча 122600 кв.м. Бібліятэка паводле сваіх памераў -- адна з найбольшых у свеце.**

**У фондах бібліятэкі знаходзіцца каля 9,4 млн адзінак інфармацыі (насельніцтва Беларусі ў 2009 г. складала 9,5 млн чалавек).**

**Для параўнання – у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, “Ленінцы” (заснаванай ў 1862 г.) ў 2012 годзе аб’ём фонда складаў 44.8 млн адзінак (насельніцтва Расійскай Федэрацыі складае 143 млн чалавек);у бібліятэцы Кангрэса ЗША (заснаванай ў 1800 г.) утрымліваецца амаль 161 млн адзінак інфармацыі (насельніцтва ЗША ў 2010 г. складала 213 млн).**

